2. Забытый мир: Рижский договор 1921 года: интерпретации и споры: научное издание / Е. Боженцкий [и др.]; под ред. С. Дембского, А.В. Мальгина (русское издание). М.: ЗАО “Аспект Пресс”, 2014.
3. Кантор, Ю.З. Война и мир Михаила Тухачевского. СПб.: Нестор. – 2008.
4. Рижский мирный договор (извлечения) // Забытый мир: Рижский договор 1921 года: интерпретации и споры: научное издание / Е. Боженцкий [и др.];; под ред. С. Дембского, А.В. Мальгина (русское издание). М.: ЗАО “Аспект Пресс”, 2014. С. 339–349.
5. Снапковский, В.Е. История внешней политики Беларуси: пособие. Минск : БГУ, 2013.
6. Materski, W. Na Widecie / II Rzeczpospolita wobec Sowietów 1918–1943. Warszawa: Instytut Studiów Politycznych PAN, 2015.

**УДК 930(438):94(438)"191/192"**

# ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ НЕЗАЛЕЖНАЙ ПОЛЬШЧЫ ПАСЛЯ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***М. М. Мязга***

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, вул. Савецкая, 104, 246019 Гомель, Беларусь, nmezga@gsu.by*

У артыкуле разглядаецца ўзаемасувязь паміж аднаўленнем незалежнасці Польшчы ў 1918 г. і развіццём польскай гістарычнай навукі. Высветлена, што польская палітычная эліта актыўна выкарыстоўвала гісторыю для легітымізацыі той палітыкі, якую яна праводзіла, у тым ліку для абгрунтавання знешнепалітычнага курса краіны.

***Ключавыя словы:*** *Польшча; незалежнасць; гістарычная навука; гістарычная палітыка; знешняя палітыка; ідэалогія; гістарычныя напрамкі і школы.*

# ПОЛЬСКАЯ ИСТОРИЧЕСКАЯ НАУКА В УСЛОВИЯХ СТАНОВЛЕНИЯ НЕЗАВИСИМОЙ ПОЛЬШИ ПОСЛЕ ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ

***Н.Н. Мезга***

*Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины, ул. Советская, 104, 246019, Гомель, Беларусь, nmezga@gsu.by*

В статье рассматривается взаимосвязь между восстановлением независимости Польши в 1918 г. и развитием польской исторической науки.

Установлено, что польская политическая элита активно использовала историю для легитимизации той политики, которую она проводила, в том числе для обоснования внешнеполитического курса страны.
***Ключевые слова:*** *Польша; независимость; историческая наука; историческая политика; внешняя политика; идеология; исторические направления и школы.*

## ON POLISH HISTORICAL SCIENCE AND ITS METHODS IN POLAND AS IT REGAINED ITS INDEPENDENCE AFTER THE FIRST WORLD WAR

***M. Miazga***

*Francisk Skorina Gomel State University,104 Savieckaja Street, Homieĺ 246019, Belarus, nmezga@gsu.by*

The article examines the relationship between the restoration of Poland’s independence in 1918 and the development of Polish historical research and its methods. It is established that the Polish political elite actively used history to legitimize the policies that supported their political agenda, as well as to justify the country’s foreign policy.
***Keywords:*** *Poland; independence; historical science; historical policy; foreign policy; ideology; historical destinations and schools.*

Першая сусветная вайна ў якасці аднаго з важных міжнародных наступстваў для рэгіёну Цэнтральна-Усходняй Еўропы мела аднаўленне незалежнасці Польшчы. Дэкляраванне незалежнасці з’яўлялася толькі першым крокам у справе станаўлення новай польскай дзяржаўнасці. Перад Польшчай, якая адрадзілася, стаялі важныя задачы па ўмацаванні сваёй дзяржаўнасці. Неабходна было вызначыць сваё месца ў Еўропе і свеце і паспрабаваць заняць яго. Адбывалася фарміраванне ідэалогіі асноўных палітычных плыняў Польшчы, дактрын развіцця дзяржавы. Важнай рысай фарміравання ідэалагічных установак розных палітычных сіл Польшчы было тое, што яны абапіраліся не столькі на пэўныя напрацоўкі ў галіне палітычнай тэорыі, колькі на выніку гістарычных даследаванняў. У XIX ст. польская рамантычная гістарыяграфіі актыўна займалася вывучэннем прычын, якія прывялі да падзелаў Рэчы Паспалітай і ліквідацыі польскай дзяржаўнасці ў канцы XVIII ст. На аснове гэтых гістарычных

даследаванняў фарміраваліся палітычныя дактрыны, якія вызначалі шляхі і метады барацьбы за аднаўленне незалежнасці краіны.

Абвяшчэнне незалежнасці Польшчы ў лістападзе 1918 г. змяніла ўмовы развіцця польскай гістарычнай навукі і паставіла перад ёй новыя задачы. Найважнейшым грамадска-палітычным фактарам, які вызначаў яе развіццё, з'яўляўся працэс станаўлення польскай дзяржаўнасці на новым этапе. Польскі гісторык С. Кеневіч адзначаў: "Атрыманне незалежнасці ў 1918 г. змяніла цалкам сітуацыю для гістарычных даследаванняў, а тым больш для навучання гісторыі Польшчы". У адрозненні ад папярэдняй эпохі зараз гэта была палітыка дзяржавы ў адносінах да таго, што адбываецца ў гісторыі [1, s. 168, 29]. Фарміруючы сваю палітыку, перш за ўсё знешнюю, дзяржава шукала ў гісторыі аргументы для яе абгрунтавання. З іншага боку, станаўленне незалежнай дзяржавы стварыла больш спрыяльныя ўмовы для развіцця польскай гістарычнай навукі. Яна стала атрымліваць падтрымку з боку дзяржавы ў рамках праводзімай ёю гістарычнай палітыкі. З яе дапамогай гістарычная навука нацэльвалася на працу, якая садзейнічала б станаўленню і ўмацаванню польскай дзяржаўнасці. У 1920 г. на канферэнцыі гісторыкаў у Варшаве адзначалася, што "праца гісторыкаў павінна быць найбольш цесна звязаная з агульнымі арганізацыйнымі намаганнямі, накіраванымі на станаўленне дзяржавы" [2, s. 4–7]. І сапраўды, польская гістарычная навука ў перыяд аднаўлення незалежнасці Польшчы была цесным чынам звязана з гэтым працэсам і большасць гісторыкаў лічылі сваім абавязкам садзейнічаць яму. Польскі гісторык і публіцыст А. Бахеньскі адзначаў, што перш за ўсё навучанне гісторыі павінна весці да фарміравання нацыянальнай ідэі, "каб яе ўсведамленне рабіла з чалавека паляка" [3, s. 55].

Для кожнага народа характэрна свая гістарычная памяць. Яна фарміруецца пад уплывам гістарычнай навукі і, у сваю чаргу, аказвае істотны ўплыў на знешнюю палітыку краіны. А. Бахеньскі адзначаў у гэтай сувязі, што на падставе гісторыі нельга ўсталяваць непасрэдна крокі для рэалізацыі сваіх палітычных намераў, але можна сцвярджаць, што "гісторыя вельмі моцна ўплывае на фарміраванне нашых намераў, нашых палітычных мэтаў". На ягоную думку, нават дастаткова даўняя гісторыя адыгрывае значную ролю ў палітыцы, і, напрыклад, для прапаганды ідэй федэрацыі ў міжваеннай Польшчы палітыкі выкарыстоўвалі ягелонскую гістарычную традыцыю [4, s. 34–35].

Важным паказчыкам узаемасувязі гісторыі і палітыкі з'яўляецца тое, што многія польскія палітыкі міжваеннага часу стварылі значную колькасць работ, прысвечаных гісторыі сваёй краіны, у тым ліку, польска-савецкіх адносін. Гэта працы Ю. Пілсудскага, С. Грабскага, У. Грабскага, Р. Дмоўскага, А. Скшыньскага, У. Сікорскага і іншых. Названыя аўтары ставілі перад сабой як галоўную задачу абгрунтаванне, легітымізацыю той палітыкі, якую праводзіў іх палітычны лагер. Польская гістарыяграфія яшчэ напярэдадні адраджэння незалежнасці краіны і адразу пасля таго, як гэта адбылося, выступіла як сродак абгрунтавання знешнепалітычных планаў сваёй дзяржавы, у прыватнасці, на ўсходзе. Яшчэ ў 1919 г. польскі гісторык О. Бальзер пісаў, што абодва палітычныя лагеры для абгрунтавання сваіх праграм (федэрацыі і інкарпарацыі) звярталіся “да гісторыі Ягелонаў і пазнейшых часоў, якія папярэднічалі падзелам Рэчы Паспалітай” [5, s. 11–13].

У польскай гістарычнай навуцы паўстала дыскусія адносна вызначэння галоўных фактараў, якія прывялі да аднаўлення незалежнасці дзяржавы. Тая частка польскіх гісторыкаў, якія былі блізкія да правых партый, перш за ўсё нацыянальнай дэмакратыі, адзначалі вырашальную ролю міжнароднага фактару ў справе аднаўлення незалежнасці Польшчы. Прыхільнікі Ю. Пілсудскага ў польскай гістарычнай навуцы ўсяляк падкрэслівалі значэнне ўласных намаганняў польскага народа ў справе аднаўлення незалежнасці Польшчы. Адлюстроўваючы дадзены пункт гледжання, Ю. Лукасевіч, буйны польскі дыпламат і публіцыст, пісаў, што ні адна дзяржава, з тых, якія ўдзельнічалі ў Першай сусветнай вайне, “не ставіла сваёй мэтай стварэнне незалежнай і тым больш моцнай Польшчы” [6, s. 14]. Такім чынам, Польшча набыццём незалежнасці абавязаная намаганням польскага народа.

Польскімі аўтарамі, блізкімі да правага лагера, перш за ўсё адзначалася роля Першай сусветнай вайны і міжнародных умоў, якія яна стварыла, у справе адраджэння польскай дзяржавы. Р. Дмоўскі пісаў у сувязі з гэтым: “Калі вайна 1914–1918 гадоў была для ўсяго свету катастрофай, з нашага, польскага пункту гледжання, стала яна чымсьці перасягнуўшым межы самых смелых, найменш рэальных мараў” [7, s. 113]. Гісторык і публіцыст У. Студніцкі сцвярджаў, што незалежнасць Польшчы прыйшла як вынік знешніх абставін, з вельмі малым удзелам і

вельмі малымі ахвярамі прадстаўнікоў цяперашняга пакалення [8, s. 6]. Пазіцыю, згодна з якой вырашальную ролю ў аднаўленні польскай незалежнасці адыгралі знешнія фактары, адстойвалі прадстаўнікі аўтарытэтнай кракаўскай гістарычнай школы [9, с.196–197].

Ва ўмовах станаўлення польскай дзяржавы асаблівую значнасць набывала пытанне аб яе межах. Польская гістарыяграфія і публіцыстыка адразу ж прыступілі да "абгрунтавання права і неабходнасці" ўсталявання польскага кантролю над украінскімі, беларускімі і літоўскімі землямі. Ужо падчас польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў у Польшчы былі выдадзеныя працы, аўтары якіх спрабавалі з пазіцыі "гістарычных правоў" апраўдаць прэтэнзіі Польшчы на землі на ўсходзе, якія не з'яўляліся этнічна польскімі. У плане абгрунтавання "правоў" Польшчы на ўсходнія "крэсы" яе гістарычная навука звярталася да выкарыстання этнаграфічнага аргументу, у прыватнасці, даказвала этнічную самастойнасць беларусаў у адносінах да рускіх. Так, С. Кутшэба яшчэ ў 1919 г. у адной са сваіх работ раскрытыкаваў "гістарычныя правы" Расіі на Літву і Беларусь. Ён сцвярджаў, што рускія несправядліва лічаць беларусаў часткай свайго этнасу. На ягоную думку, беларусы складаюць "асобнае этнаграфічнае славянскае племя", беларуская мова з'яўляецца асобнай, яна "напоўненая польскімі словамі і лепш разумеецца палякамі, чым рускімі" [10, s. 187–190].

Яшчэ адзін аргумент, які прыводзілі польскія даследчыкі для абгрунтавання прасоўвання на беларускія, літоўскія і ўкраінскія землі, – тэзіс аб вызваленчай і цывілізатарскай місіі Польшчы. К. Олендзкі, напрыклад, кажа ў сваіх працах аб імкненні Польшчы прынесці на "ўсходнія крэсы" палітычныя і грамадзянскія свабоды, пазбавіць іх насельніцтва ад голаду. Перавага выбару ўсходніх суседзяў на карысць аб'яднання з Польшчай, на яго думку, заключаецца ў тым, што "лепш ісці з асвечаным Захадам, чым варварскім Усходам, які ... з ідэй камунізму ўчыніў сумесь крыві, ганьбы і прыгнёту". Ён усяляк імкнуўся абгрунтаваць тэзіс аб тым, што насельніцтва гэтых тэрыторый не ў стане стварыць урад, "здольны забяспечыць нармальны ўзровень матэрыяльнага жыцця". На яго думку, любы ўрад, які ўзнікне на гэтай тэрыторыі, будзе мець патрэбу ў падтрымцы суседніх дзяржаў. Ролю такой дзяржавы павінна заняць Польшча [11, s. 10, 8].

У. Студніцкі імкнецца даказаць выгаднасць уключэння ўсходніх "крэсаў" у склад Польскай дзяржавы для мясцовага насельніцтва. На яго

думку, у сілу значэння гэтага краю для Польшчы, яна не будзе шкадаваць сродкаў для інвестыцый у яго развіццё. Калі ж Літва і Беларусь застануцца ў складзе Расіі, яны будуць асуджаныя і далей на запаволенне свайго гаспадарчага развіцця. На ягоную думку, Польшча не можа існаваць у этнічнай мяжы. Інтарэсы абароны Польшчы патрабуюць, каб лінія яе мяжы на ўсходзе праходзіла па верхнім Дняпры, Бярэзіне, Прыпяці, а на поўначы – па Дзвіне. Толькі ў гэтым выпадку яна зможа спыніць будучы націск з боку Расіі. У. Студніцкі адстойваў канцэпцыю інкарпарацыі і выступаў за непасрэднае ўключэнне гэтых тэрыторый у склад Польшчы і супраць стварэння Вялікага Княства Літоўскага, якое знаходзілася б у федэрацыі з ёй [12, s. 23–27, 5].

У шэрагу гісторыка-публіцыстычных работ выкладаліся канкрэтныя планы дзяржаўна-тэрытарыяльнага будаўніцтва адроджанай Польшчы. Так, С. Казіцкі наступным чынам выкладаў мэты польскай палітыкі на ўсходзе: “1) Утварэнне этнаграфічнай Літвы ў дзяржаўнай уніі з Польшчай. 2) Перадача Польшчы заходняй часткі Белай Русі, пераважна каталіцкай, са значнай доляй польскага насельніцтва ... Такое размежаванне на Украіне, якое дало б Польшчы Заходнюю Валынь і два паветы Падолля (Праскураўскі і Камянецкі)” [13, s. 131].

Такім чынам, гістарычная навука стала важным фактарам у справе фарміравання ідэалогіі розных палітычных сіл Польшчы і тым самым аказвала ўплыў на фарміраванне палітыкі адроджанай польскай дзяржавы, у тым ліку і ва ўсходнім напрамку. Гісторыя стала і інструментам барацьбы паміж рознымі палітычнымі сіламі краіны. Кожная палітычная плынь імкнулася абгрунтаваць сваё бачанне развіцця польскай дзяржаўнасці і аргументы шукала ў польскай гісторыі. Так, для вырашэння пытання станаўлення польскай усходняй мяжы пасля аднаўлення незалежнасці Польшчы яе палітыкі вылучылі дзве канцэпцыі: федэрацыя і інкарпарацыя. І для кожнай з іх імкнуліся знайсці абгрунтаванне ў польскай гісторыі. У залежнасці ад падтрымкі адной з гэтых дзвюх канцэпцый утварылася і два напрамкі ў польскай гістарыяграфіі, кожны з якіх у сувязі са сваімі палітычнымі прыхільнасцямі імкнуўся даказаць перавагі адной з названых канцэпцый. Пры гэтым розныя напрамкі польскай гістарыяграфіі лічылі сябе абавязанымі сваімі навуковымі пошукамі садзейнічаць умацаванню польскай дзяржаўнасці. Са свайго боку дзяржава сваёй гістарычнай палітыкай імкнулася накіраваць даследаванні гісторыкаў на рашэнне гэтай задачы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Kieniewicz, S. Historyk a swiadomosć narodowa. Warszawa: Czytelnik, 1982.
2. Zakrzewski, S. Historiografia polska wobec wskrzeszenia panstwa. Lwow: Druk. zakładu narodowego im. Ossolińskiech, 1924.
3. Bochieński, A. Rozmyślania o polityce polskiej. Warszawa: Krajowa Agencja Wydawnicza, 1987.
4. Bocheński, A. Historia i polityka. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1989.
5. Balzer, O. Tradycja dziejowa unii polsko-litewskiej. Warszawa: Nakładem księgarni Gubrunowicza i syna, 1919.
6. Łukasiewicz, J. Polska jest mocarstwem. Warszawa: Narład Gebethnera i Wolffa, 1938.
7. Dmowski, R. Polityka Polska i odbudowanie Panstwa. Wydanie drugie. Warszawa: Nakładem księgarni Perzyński, Niklewiecz i s-ka, 1926.
8. Studnicki, W. Z przeeżyc i walk. Warszawa: Drukarnia Wł. Łazarskiego, 1928.
9. Сінкевіч, Е.Г. Місце краковської історичної школы в польскій історіографіі // Український історичний журнал. 2008. № 1. С. 194–201.
10. Kutrzeba, S. Kongres, traktat i Polska. Warszawa:, 1919.
11. Olęndzki, K. Kresy wschodnie a Polska. Warszawa: Druk. Z. Swiętóńskiego, 1919.
12. Studnicki, W. Połnoncno-wshodnie ziemie dawnej Rzeczypospolitej Polski. Warszawa: Druk Synòw St. Niemiry, 1919.
13. Kozicki, S. Sprawa granic Polski na konferencji pokojowej w Paryżu. Warszawa: Przyński, Niklewiiecz i Spòlka, 1921.

**УДК [94(476) + 327(438:47+57)(091)]”1920/1921”**

# ДА ПЫТАННЯ АБ УДЗЕЛЕ БЕЛАРУСКІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ У ПРАЦЫ РЫЖСКАЙ МІРНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ (ВЕРАСЕНЬ 1920 г. – САКАВІК 1921 г.)

***В.М. Бароўская***

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

Падчас мірнай канферэнцыі былі прадстаўлены розныя варыянты вырашэння будучыні тэрыторыі Беларусі, але выбар на карысць той або іншай альтэрнатывы, на жаль, ажыццяўляўся без удзелу беларускага боку, беларускія прадстаўнікі выступалі ў якасці назіральнікаў у складзе польскай ці савецкай дэлегацый. Прысутнасць беларускіх прадстаўнікоў падчас прац мірнай канферэнцыі не паўплывала на рашэнні, прымаемыя членамі і